**І. Н. Колабава**
*Мінск, Беларусь*

# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ЭПІСТАЛЯРНАЙ СПАДЧЫНЫ В. Н. РАБЦЭВІЧА

Эпістальярная спадчына В. Н. Рабцэвіча знаходзіцца на захоўванні ў Архіве Дзяржаўнага Эрмітажа ў асабістым фондзе выбітнага вучонага, заснавальніка савецкай школы нумізматыкі І. Г. Спаскага (Архив ГЭ, ф. 1, оп. 17, 20, 21). Ксеракопіі гэтых лістоў былі ласкава перададзены аўтару калегай В. Н. Рабцэвіча – М. П. Сотнікавай. Асноўная іх маса (47 адз. зах.) звернуты да І. Г. Спаскага, некалькі – да яго калег (І. Г. Дабравольскага – 2 адз. зах.; М. Б. Северавай – 1 адз. зах.).

Захаваўшаяся частка перапіскі В. Н. Рабцэвіча з І. Г. Спаскім (рукапіс і машынапіс) ахоплівае перыяд з ліпеня 1960 г. па май 1980 г. Ролю І. Г. Спаскага ў фарміраванні Валянціна Навумавіча як навукоўца пераацаніць немагчыма. Іх першая сустрэча адбылася ў 1959 г. Як пісаў сам Валянцін Навумавіч, «тогда же был полностью разрушен сложившийся в моем воображении образ величаво-замкнутого седовласого мэтра: я увидел удивительно простого, приветливого и участливого человека» (Рябцевич, 2004. С. 43).

Асноўнае месца ў гэтай перапісцы займаюць пытанні правядзення навуковай работы. Разумеючы ўсю цікавасць асвятлення гэтага накірунка дзейнасці Валенціна Навумавіча, нельга не звярнуць увагу і на некаторыя іншыя моманты, якія больш шырока характарызуюць асобу самаго Валянціна Навумавіча – удзел у археалагічных экспедыцыях, успрыманне прыроднага асяроддзя, працу над стварэннем мюнцкабінета і інш.

## Спіс літаратуры

*Рябцевич В. Н.* Учителю // Хранитель Эрмитажа. Сборник воспоминаний и научных статей к 100-летию со дня рождения И. Г. Спасского (1904–1990). СПб., 2004. С. 43–44.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm



И. Г. Спасский и В. Н. Рябцевич. 1984 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm